**В. А. Буднік**
Беларусь, Брэст, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт

# ТЫПАЛОГІЯ ЖАНОЧЫХ ВОБРАЗАЎ У РАМАНЕ І. ПТАШНІКАВА “АЛІМПІЯДА”

У беларускай духоўна-мастацкай прасторы другой паловы XX ст. вобраз жанчыны – адзін з самых ёмістых. Ён аб’ядноўвае тыпалагічныя рысы пяшчотнай і нястомнай матулі-працаўніцы, жанчыны-патрыёткі, на долю якой выпала змаганне супраць фашыстаў за волю роднай зямлі, за захаванне дзяцей і сям’і ў суровы час акупацыі. У беларускай літаратуры ў драматычнай велічы прадстаўлены высокамастацкія вобразы трывушчых жанчын-удоў, салдатак, чые мужы, гаспадары, каханыя загінулі на вайне ці былі рэпрэсаваны яшчэ ў даваенны час. Працай, каханнем, любоўю, самаахвярнасцю беларускіх жанчын неаднойчы ў гісторыі адраджалася жыццё на нашай зямлі. І як гэта часта бывае, у сітуацыі жыццёвай хісткасці, небяспекі жанчына бярэ на сябе адказнасць у выратаванні іншых. Вобраз і лёс беларускай жанчыны знаходзіць шматаспектнае ўвасабленне ў нашай літаратуры.

Адметнае месца ў шэрагу выдатных твораў нацыянальнай прозы, дзе створаны высокамастацкі вобраз маці-працаўніцы і ахавальніцы жыцця, займае раман І. Пташнікава “Алімпіяда” (1984). Пісьменнік рэалістычна, псіхалагічна дакладна ўзнаўляе напружанае, бязмерна цяжкае жыццё беларускай калгаснай вёскі 60-х гг. XX ст. і стварае шэраг пераканаўчых жаночых вобразаў-тыпаў. Галоўная гераіня рамана – калгасніца, сялянка Алімпіяда Падаляк. Менавіта гэты вобраз арганізуе ўсю вобразную сістэму ў творы, у ім у вялікай ступені выяўлены адносіны аўтара да жыцця, да навакольнага свету.

Пры стварэнні вобраза галоўнай гераіні, жанчыны-маці, І. Пташнікаў абапіраўся на аўтабіяграфічны вопыт. Вядома, што ў рамане “Алімпіяда” пісьменнік увасобіў лёс роднай маці, якой у той час ужо не было. На сустрэчах з чытачамі І. Пташнікаў успамінаў, як у красавіку 1943 г. маці на тры дні знікла з дому, бо даведалася, што ў далёкай вёсцы, больш за трыццаць кіламетраў ад роднага Задроздзя, гінуць каровы. Яна, юная жанчына, прайшла семдзесят кіламетраў, каб здабыць сваім дзецям карову. Два дні крок за крокам, упрошваючы, падштурхоўваючы, плачучы, праклінаючы і спадзеючыся, вяла яна карміцельку дадому. Дасягнуўшы мэты, дайшоўшы да пагорка роднай вёскі, маці і карова знясілена ўпалі пад красавіцкім сонцам. Гэтыя ўспаміны пісьменніка аб трывучасці роднай матулі абумовілі яго творчую пазіцыю. У асаблівай увазе І. Пташнікава да жанчыны-працаўніцы, сціплай, спакойнай, цярплівай, чулай, бачыцца сцвярджэнне жыццятворнага пачатку лёсу беларускі.

Рэцыпіент разам з аўтарам захапляюцца галоўнай гераіняй рамана “Алімпіяда”. Асноўныя сюжэтныя падзеі твора адбываюцца ў першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі. Аднак вайна ўсё яшчэ жыве ў памяці і свядомасці герояў, жыхароў старэйшага пакалення, беларускіх вяскоўцаў. Сталенне галоўнай гераіні Алімпіяды адбывалася ў драматычны ваенны і пасляваенны час.

Яна згадвае кароткае шчасце сямейнага жыцця, нараджэнне сына Міфодзі і дачкі Тані, заўчасную смерць мужа Мікалая. Усё жыццё Улімы – цяжкая, непасільная праца ў калгасе, на ферме.

У асноўнай сюжэтнай лініі І. Пташнікаў адлюстроўвае якраз той перыяд жыцця гераіні, калі яна, ужо немаладая, спрацаваная за жыццё, адчула, што "дажывае". Алімпіяда вельмі часта ў думках звяртаецца да мінулага. Праз увесь раман рэтраспектыўным планам праходзіць жыццё гераіні. Ствараючы вобраз Алімпіяды, аўтар засяроджваецца на самым важным, галоўным, тым, што вызначае мэту і сэнс існавання чалавека на свеце. Даваеннае жыццё паказана сцісла, ваеннае ліхалецце – праз нешматлікія, але памятныя драматычныя эпізоды і спробы ўратаваць параненых чырвонаармейцаў. Для разумення характару гераіні яны маюць вялікае значэнне. Алімпіяда і яе муж Мікалай ратуюць двух параненых лётчыкаў. Яны нават думкі не дапускаюць, што можна пакінуць байцоў без дапамогі. Ратуючы чырвонаармейцаў, яны не думалі пра небяспеку, што гэта магло б скончыцца трагічна для ўсёй сям'і. Для Алімпіяды бездапаможныя байцы – нібы яе дзеці. Схаваўшы іх у лесе і потым робячы ім перавязкі, гераіня зусім не думала пра сябе. Яна без ваганняў, спакойна і звыкла ўзялася выходжваць чырвонаармейцаў. Калі смяротэльная небяспека навісла над гераіняй, яна спакойна і смела глядзела ў вочы здрадніку Кукаеву. Нягледзячы на пагрозу сваёй сям'і, Алімпіяда рызыкуе і застаецца чалавекам – чулым, спагадлівым і сумленным.

У сістэме жаночых вобразаў рамана Алімпіяда ўяўляе сабою выключэнне. У абліччы гэтай гераіні ў асабліва сканцэнтраваным выглядзе сабраны лепшыя маральныя і духоўныя якасці, уласцівыя беларускаму жаночаму характару. На прыкладзе Алімпіяды аўтар стварыў вобраз самаахвярнай жанчыны, маці, працаўніцы, паказаўшы яе ў паўсядзённай нястомнасці, у сямейных адносінах, сапраўднай духоўнай годнасці і маральнай прывабнасці. У вобразе Алімпіяды ўвасоблены архетыпавы для беларускай сацыякультурнай прасторы тып маці-сялянкі. Вобраз гэтай пташнікаўскай гераіні стаў яшчэ адным важным вобразам-архетыпам жанчыны і маці ў беларускай літаратуры другой паловы XX ст. Аўтар акцэнтуе ўвагу на духоўным свеце гераіні, на яе прыроджанай душэўнай мудрасці, на ўменні прымірыцца з абставінамі і застацца годнай.

Вобразы іншых гераінь – Сцяпанаўны, Марфы, Гілены Чайкі – пададзены таксама ў складанасці і драматызме лёсаў, часам з аўтарскім падкрэсліваннем асобных супярэчлівых момантаў у іх паводзінах, узаемадачыненнях і выказваннях. Алімпіяда ж цалкам пазбаўлена аўтарскай крытыкі, гэта гераіня ідэалізуецца пісьменнікам. Найбольш трагічна-балючы вобраз санітаркі Сцяпанаўны. "Сцяпанаўне скора шэсцьдзесят. За апошнія гады яна зусім пастарэла: абвіслі шчокі, выцвілі вочы, пабялелі, як позні сон" [2, с. 173]. Падчас вайны ўся яе сям'я загінула: немцы закрылі іх у хаце і падпалілі. Яе ў гэты час не было дома, а калі вярнулася "сабрала на пажарышчы… абгарэлыя косці: усё, што засталося ад сям'і, занясла іх праз выганчык на могілкі…" [2, с. 173].

Лёс Сцяпанаўны ўражвае сваёй жудаснай, балючай праўдай. Хоць яна і выжыла, але вайна назаўсёды засталася з ёй. Жыццё Сцяпанаўны спынілася

разам з жыццём яе сына і мужа. З таго моманту яна ўжо не жыла, а толькі існавала фізічна. Пасля вайны Сцяпанаўна рабіла дзесьці гадоў пяць далёка ад дому на спіртзаводзе. Навучылася выпіваць, лаяцца, як мужчына. “Рабіла на ферме доўга, аж пакуль не пачалі балець ногі ад гумавых ботаў дзень-ноч у холадзе, у макраце, у гразі”, а потым пайшла ў бальніцу санітаркай, але адразу пачала красці спірт і піць. Піла, каб хоць на імгненне пазбыцца пякельных успамінаў. “Расказвала сама, што ў вачах у яе стаіць часта новы зруб ад хаты і яна не можа нікуды ад яго ўцячы… Ад гэтага піла, каб заснуць і забыцца на ўсё” [2, с. 174]. Яна рэзкая, часта грубаватая, можа кожнаму сказаць самыя непрыемныя словы, можа любога аблаяць. Але не ад злой натуры яна так робіць. Яна не можа чуць пра вайну. “– Ды я радзіва на сцяне і то выключаю, калі яно пра вайну пачынае гаварыць… Мне тады – як хто белым абрусам па вачах… у які я костачкі абгарэлыя закруціла…” Яна працавіты чалавек, шырокай душы, шчыры, спачувае хворым. Алімпіядзе, якую яна неяк па-асабліваму паважае, кажа: “Гэта толькі здаецца, што я адна… А так – я не адна. Я з вамі з усімі… Людзям толькі здаецца, што я адна. А я – не адна…” [2, с. 179].

Сцяпанаўна з асаблівай цеплынёй ставіцца да Алімпіяды, бачачы яе слабасць. Нягледзячы на тое што лёс Сцяпанаўны складаўся вельмі трагічна, пісьменнік заўважае, што гэтую жанчыну па жыцці вядзе інстынкт нязломнасці беларускай сялянкі: трэба працаваць, дапамагаць людзям, а значыць жыць. Вобраз Сцяпанаўны неадназначны, супярэчлівы. Даследчыца В. Палтаран слушна заўважала: “Пташнікаў – майстар яркага, псіхалагічна глыбокага мастацкага вобраза. Ён не ведае страху перад жыццём… паказвае такую праўду, ад якое, як кажа адзін з герояў яго рамана, “мароз па скуры”. Да такіх глыбока трагічных вобразаў, яшчэ не знаных нашай літаратурай, належыць Сцяпанаўна… Але, калі ў спакутаванай яе душы асядзе каламуць і выблісне іскрынка чалавечнасці, дабраты, як любіш, як шкадуеш тады Сцяпанаўну, якім пранікаешся спачуваннем да яе загубленага жыцця…” [1, с. 23]. Пастаянная лаянка, грубасць, нявытрыманасць, імкненне гаварыць, як ёй здаецца, праўду ў вочы – у кожным учынку і слове адчуваецца праўда часу, абставін і характару.

Іншыя створаныя І. Пташнікавым жаночыя вобразы не менш цікавыя, а іх знешняя другараднасць кампенсуецца сэнсавай значнасцю, бо ў прыватным лёсе асобнага чалавека адлюстроўваецца хроніка жыцця ўсяго пакалення. Такім, у прыватнасці, з’яўляецца эпізадычны вобраз Анастасіі Іпалітаўны Праскурніч’і. Яна працавала ў бальніцы медсястрой. Падчас вайны была медсястрой на фронце, а пасля вяла ў школе фізкультуру і ваенную падрыхтоўку. Яна была рухавай, маладзілася, як гаварыла пра яе Сцяпанаўна. Сыны даўно выраслі, і цяпер “дома ў яе ўсягда было пуста”, а да пастарэлага мужа вяртацца яна не спяшалася. Таму нават пасля работы заставалася ў бальніцы з хворымі. Жыццё гэтай гераіні хоць і не было трагічным, усё ж у гэтым вобразе аўтар паказаў жанчыну, у якой яшчэ многа нерастрачанай любові, не выкананага да канца прызначэння – бараніць. Гэтыя нерастрачаныя сілы яна зараз аддае хворым у бальніцы. Нягледзячы на тое, што вайна таксама закранула яе, жанчына не страціла пачуцця дабрыні, адказнасці, жыццястойкасці, сама-

ахвярнасці. Гэтай гераіні ўласцівы спачувальны падыход да любога хворага. Яна працягвае дапамагаць хворым людзям.

У тыпалогіі жаночых вобразаў рамана вылучаецца і вобраз Гілены Чайкі. Аўтар характарызуе яе як жанчыну "з добрай душой", якая "магла спагадаць любому на свеце" [2, с. 165]. Жыццё яе было цяжкім, як і ў большасці жанчын, жыццё якіх абпаліла вайна. Не вярнуўся з партызан яе муж. А сын адслужыў у войску і застаўся працаваць на заводзе ў Мінску. Некалькі разоў выходзіла замуж, каб уратавацца ад адзіноты, але жыццё не складвалася. Яно было ўвесь час няўстойлівым і зменным. Калі для Алімпіяды галоўным сэнсам яе жыцця з'яўляюцца дзеці і клопат пра іх, то для Чайкі важна мець мужа, "каб усё было як у людзей" [2, с. 166]. Таму яна ў няспынным пошуку свайго шчасця, якое яна бачыць у тым, каб побач быў родны сэрцу чалавек. Аўтар паказвае, што ў пасляваенныя часы многія жанчыны засталіся адзінокімі, удовамі. Для гераіні, як і для кожнага чалавека, сапраўднай каштоўнасцю застаецца сям'я, сагрэтая атмасферай узаемнай любові, павагі, шчырасці, добрасці і сардэчнасці. Гэтай гераіні І. Пташнікаў дае права шукаць сваё шчасце, памыляцца, выпраўляць памылкі, знаходзіць новае каханне, загойваць душэўныя раны. Паказваючы балючыя працэсы ў сферы чалавечых пачуццяў, І. Пташнікаў не імкнецца да маралізацыі, а больш спачувае Гілене Чайцы.

Яшчэ адна гераіня рамана – Марфа, вобраз якой пераклікаецца з вобразамі іншых гераінь твора. Яна таксама зараз ляжыць у бальніцы, як і Алімпіяда. У мінулым гэта жанчына мела мужчынскую прафесію, пасля вайны працавала трактарысткай. Марфа крыху старэйшая за Алімпіяду. Яна ніколі не была замужам, не мела дзяцей, жыла з сястрой, дапамагаючы ёй пасля смерці мужа гадаваць і падымаць пляменнікаў. У вобразе Марфы пісьменнік увасобіў спрадвечныя рысы беларускай жанчыны, якая ўмее браць на свае плечы чужы клопат. Унутраная гатоўнасць да спачування і дапамогі, нязвольнасць пакінуць чалавека ў бядзе – характэрныя рысы нацыянальнага жаночага вобраза ў рамане І. Пташнікава.

Усіх гэтых другарадных гераінь вызначае агульнае жаданне мець сям'ю, быць гаспадыняй у сваім доме. Пісьменнік удала стварыў групавы партрэт беларускіх жанчын, якія выносілі на сваіх плячах цяжар жыцця ў акупацыі ў час вайны, і ў пасляваенны час, гадуючы дзяцей, працуючы за мужчын, што загінулі або вярнуліся калекамі, нямоглымі. Жанчыны не шкадавалі, не ашчаджалі сябе ў цяжкай калгаснай працы. На іх трымалася пасляваеннае жыццё ў Беларусі. Важнымі эпізодамі твора з'яўляюцца падзеі ў бальніцы, дзе спрацаваныя, надарваныя вайной і пасляваеннай калгаснай працай пажылыя вяскоўцы асэнсоўваюць пражытае. І. Пташнікаў псіхалагічна адметна і пераканаўча, з вялікай увагай да кожнага перадае ўнутраны свет герояў, іх лёсы. І вызначальным пачуццём аўтара і герояў, несумненна, з'яўляецца *боль*. Вобразы хворых са сваімі гісторыямі і ўласным болем гераінь дапамагаюць сучаснаму рэцыпіенту адчуць драматызм жыцця беларускага народа ў пасляваенныя дзесяцігоддзі. Нязломнасць характару – важная тыпалагічная рыса, якой аб'яднаны большасць гераінь гэтага твора.

Таня – дачка і спадчынніца Алімпіяды па жыцці і па духу. Дзяўчына чулая душой і ўнутрана патрабавальная, як і маці. Яна не можа жыць, як набяжыць. І. Пташнікаў надае ўвагу інтымным пачуццям гэтай маладой гераіні. Праяўленне ў каханні і пачуццях найбольш характарызуе аблічча гераіні. Яна рашуча рве са сваім юнацкім каханнем, як толькі адчула, што Ратнікаў нясе ў душы злосць і недастатковую выхаванасць. Але дзяўчына не кідаецца безразважліва і насустрач новаму пачуццю. Ёй падабаецца Фірага, але нешта і стрымлівае яе. У асобных момантах гераіні не хапае большага кругагляду, большага роздуму над жыццём. Сцэна пахавання Фірагі раскрывае ўнутраную маральную сутнасць дзяўчыны, падкрэслівае яе безумоўную добразычлівасць і вынослівасць. Таня не можа дапусціць, каб чалавек пайшоў з гэтага свету не аплаканы роднымі: “Яна нікога не бачыла – у вачах было толькі чырвонае дамаўё і белая пляма бінту ў ім, – праціснулася наперад да жоўтай кучкі пяску, падбегла да дамаўя і, растапырыўшы рукі, упала ля клятчастых рубашак, якія дзяржалі ў руках века, на чорны касцюм, ловячы рукамі яго складзеныя на грудзях белыя ў бінце рукі і, рассыпаючы свежыя, яшчэ не прывялыя ад сонца за дарогу жоўтыя юргіні з гародчыка, якія ён вунь як любіў… Закрычала, затраслася, прымаўляючы, сама не помнячы што… Пачула толькі, як зашумеў ззаду натоўп, як аціх, перастаў быў іграць аркестр… У чалавека дагэтуль не было свайго чалавека… Цяпер ён быў, знайшоўся і прыйшоў, каб упасці яму на грудзі апошні раз…” [2, с. 489]. Галоўная ўвага пісьменніка засяроджана на ўнутраных перажываннях дзяўчыны. Для І. Пташнікава важна не толькі расказаць падзею, але і псіхалагічна тонка зафіксаваць думкі і перажыванні героя. У думках Таня часта звяртаецца да маці, як бы размаўляе з ёй. Гэтым нараталагічным прыёмам пісьменнік падкрэслівае іх духоўную сувязь, шлях дзяўчыны да маральнай сталасці, непакой чалавека, яго ўнутраны разлад, бо менавіта ў вобразе маці яна хоча знайсці адказ на хвалюючыя пытанні. Пачуццё еднасці з маці мацуе волю маладой гераіні, загартоўвае яе характар. Уважлівая фіксацыя аўтарам дэталяў, якія выхоплівае свядомасць дзяўчыны, стварае адчуванне напружанасці, мітусні яе думак. Пададзеныя пісьменнікам фрагменты рэчаіснасці ўзмацняюць драматызм светаадчуванне дзяўчыны, якая ўпершыню ў жыцці перажывае страту блізкага чалавека.

Душэўную драму дачкі добра разумее Алімпіяда, і не толькі разумее – яна адчувае віну перад ёй, як і перад сынам Міфодзем, “за ўсё тое балючае, што ім давялося спаткаць у жыцці” [2, с. 527]. Пісьменнік закранае яшчэ адну тэму – вінаватасці бацькоў за боль сваіх дзяцей. Бацькі, якія вынеслі на сваіх плячах усе жахі вайны, надзелены вострым пачуццём адказнасці не так за свой, як за чужы боль. Маці гатовая ўзяць боль сваіх дзяцей на сябе. Алімпіяда імкнецца выхаваць такую ж гатоўнасць і ў сваіх дзяцей.

Выдатна, з глыбокім пранікненнем ва ўнутраны свет герояў, з дакладным псіхалагізмам паказана сустрэча Алімпіяды з дачкой пасля пахавання Фірагі. “Таня стаяла блізка, якраз на рог ложка. Асунулася, падаўжэў нос, завастрыўся, вочы парабіліся шэрыя, як сухі лубін. Стаяла злосная, капрызная, непрыступная. Скажы што не так – на сцяну палезе… Алімпіяда глядзела і глядзела на яе

здалёку; вочы заслала агнём жоўтая спружына, і праз гэты агонь, як праз сонца, твар у Тані здаўся раптам маленькім, востранькім, як у маладзенькай птушачкі, якую ветрам скінула з гнязда. Птушка плюскае вачанятамі, хаўкае востранькай жоўтай дзюбкай – збіраецца запішчаць і не можа. І так шкода стала гэтага птушаняці, што яна задрыжала ад хліпу сама – хоча нешта сказаць, а голас не слухаецца...” [2, с. 539]. Так убачыць і адчуць унутраны стан дачкі можа толькі маці. Увогуле ўся сцэна сустрэчы маці і дачкі насычана душэўна-эмацыянальным зместам. Па сцэне сустрэчы Алімпіяды з Таняй можна меркаваць пра характар узаемаадносін у сям’і Алімпіяды, дзе ўсё трымаецца на павазе, глыбокім даверы.

Вобразы гераінь рамана “Алімпіяда” надзелены архетыпавымі рысамі: ахвярнасцю, зычлівасцю і бязмежнай любоўю да дзяцей і роднага краю, якія ў крытычнай сітуацыі ўзбуйняюцца да рашучасці, адвагі, бескампраміснай сумленнасці і самаахвярнасці.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Палтаран, В. Яго вялікасць жыццё / В. Палтаран // Беларусь : маст.-літ. часоп. – 1986. – № 6. – С. 23.

2. Пташнікаў, І. Збор твораў : у 4 т. / І. Пташнікаў. – Мінск : Маст. літ., 1992. – Т. 4 : Раман. – 575 с.